ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№ 12(1025) | *АЎТОРАК, 25 чэрвеня 2002 г.* | *Газета заснавана ў верасні 1969 года* | *Выходзіць два разы ў месяц* | *Цана дагаворная*

## ВЫПУСКНІКАМ ГДУ – ШЧАСЛІВАГА ШЛЯХУ Ў САМАСТОЙНАЕ ПРАЦОЎНАЕ ЖЫЦЦЁ!

*СТУДЭНТАМ – ПАСПЯХОВАГА ЗАВЯРШЭННЯ ВЯСНОВАЙ СЕСІІ І ЗДАРОВАГА АДПАЧЫНКУ!*

**АБІТУРЫЕНТАМ – ЛЁГКІХ БІЛЕТАЎ НА ЎСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАХ!**



У вучэбных карпусах універсітэта зранку – нібы ў патрывожаным вуллі. Экзаменацыйная стыхія з уласцівымі ёй мітуснёй, хваляваннямі, слязамі радасці, а часам і адчаю на вачах, ліхаманкавым гартаннем старонак падручнікаў, канспектаў перад дзвярамі, за якімі выкладчыкі правяраюць на трываласць студэнцкія веды, уладарыць у ГДУ увесь месяц чэрвень. І нягледзячы на тое, якое надвор'е на вуліцы, у аўдыторыях і калідорах па-сапраўднаму горача ад напалу страсцей і пачуццяў.

Многіх студэнтаў можна



лічыць ужо шчаслівчыкамі, бо яны скінулі груз усіх гэтых хваляванняў і згодна вучэбнага плана адправіліся на практыку. Сярод "першапраходцаў" сесіі, студэнты біялагічнага і геолага-геаграфічнага факультэтаў. Так, чацвёртакурснікі біяфака пасля здачы чатырох экзаменаў спачатку крыху папрацавалі ў лабараторыях кафедр, а затым адправіліся замацоўваць атрыманыя на занятках веды на вучэбна-навуковую базу "Чонкі", у дзіцячы санаторый "Жывіца", які размяшчаецца таксама ў гэтым урочышчы, на Гомельскую птушкафабрыку, у ВА "Беларуснафта". З добрым настроем прыступілі да практыкі тыя, хто мае ў залікоўках толькі выдатныя і добрыя адзнакі. У гр. Б-41, у прыватнасці, атрымалі пяцёркі пры здачы такіх дысцыплін, як "Уводзіны ў біятэхналогію", "Тэорыя эвалюцый", "Экалогія і рацыянальнае прыродакарыстанне" і прадмета па спецыялізацыі Людміла Шаўцова (дарэчы, стараста групы), Вольга Собчанка, Аксана Барбацько, Вольга Дубініна, Вольга Карытка. У астатніх дзвюх групах таксама нямала студэнтаў, чые добрасумленныя адносіны да вучобы па вартасці ацэнены выкладчыкамі. Сярод іх – Юлія Бачура, Наталля Белянок, Юрый Вераб'ёў, Таццяна Ракава, Алена Шаблюк, Дзмітрый Гаспадароў, Паліна Барабанава, Наталля Ходас, Анатоль Пахальчук і інш.

Не ствараюць асаблівых праблем на факультэце першакурснікі, якія адаптаваліся да рытму студэнцкага жыцця, падышлі да экзаменаў летняй сесіі без "хвастоў" па заліках. Лідэры ў вучобе першай і трэцяй груп – Таццяна Варанухіна, Вольга Баброўская, Ірына Шыпкова, Сцяпан Шульга, Дзмітрый Каган, Марына Шабаліна, Людміла Селязнёва. Яны могуць служыць сапраўдным прыкладам для студэнтаў гр. БР-12, дзе, на жаль, ніводнага выдатніка няма.

У наступным месяцы ліпені на біяфаку адбудзецца своеасаблівая "перастаноўка" сіл. Экзаменацыйную сесію будуць трымаць студэнты другога і трэцяга курсаў, якія зараз праходзяць практыку, а зменяць іх тыя, хто заканчвае апошнія выпрабаванні на веды.

Цішыню чытальных залаў, бібліятэк, напружанне ад колькасці прачытаных старонак, кніг і канспектаў лекцый ужо змянілі на прыродную ідылію будучыя геолагі. Іх месца практыкі ў Чонках, у ваколіцах г.Гомеля.

Поспехі, няўдачы, радасць і засмучэнне – усё гэта прысутнічае на экзаменах у большай ці меншай ступені на астатніх факультэтах ГДУ. Для многіх бягучая сесія – і добры ўрок, як працаваць у вучэбным семестры, планаваць свой час, каб атрымліваўся добры вынік і ў заліковай кніжцы з'яўляліся лепшыя адзнакі.

Апошнія самыя сур'ёзныя і адказныя выпрабаванні ў студэнцкім жыцці трымалі і пяцікурснікі перад патрабавальнымі камісіямі пры абароне дыпломных работ і здачы дзяржаўных выпускных экзаменаў. І цяпер перад імі – шлях у самастойнае працоўнае жыццё. Няхай будзе ён для іх шчаслівым!

**Т.НІКАЛАЕВА.**

**На здымках: на экзамене па ядзернай фізіцы студэнт гр. Ф-32 фізічнага факультэта Канстанцін Васілец паказаў выдатныя веды, і асістэнт кафедры тэарэтычнай фізікі А.М. Дзеружкова ацаніла яго адказ вышэйшым балам.**

**Таццяна Сеніна, пяцікурсніца факультэта замежных моў спецыяльнасці "Англійская мова", на працягу ўсіх студэнцкіх гадоў была сапраўдным прыкладам у вучобе для сваіх аднакурснікаў: удастойвалася стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Пацвердзіла дзяўчына свае выдатныя веды і ў час здачы дзяржаўнага экзамена па нямецкай мове.**

**Фота У.Чысціка.**

## УДАСТОЕНЫ ВЫСОКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЗНАГАРОДЫ



За значны асабісты ўклад у развіццё айчыннай навукі і шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь **ордэнам ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ** ўзнагароджаны прафесар кафедры алгебры і геаметрыі нашага універсітэта, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі **ШАМЯТКОЎ Леанід Аляксандравіч.** З гэтай нагоды яго горача віншуюць рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, увесь калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў, яго былыя вучні і жадаюць Леаніду Аляксандравічу моцнага здароўя, яшчэ доўгіх гадоў плённай працы на ніве навукова-педагагічнай дзейнасці.

## "МЫ ЭТО МОЖЕМ"

Так называлась областная выставка творческих работ детей и молодежи с физическими ограничениями, которая работала в выставочном зале ГГУ имени Ф.Скорины. На ней представили свои интересные и оригинальные изделия в самых разных жанрах 54 участника в возрасте от 10 до 30 лет.

Посетителей выставки радовал и удивлял полет авторской фантазии, технический уровень исполнения представленных здесь экспонатов – от изделий декоративно-прикладного творчества (резьба по дереву, живопись, икебана, вязание, бисероплетение) до поэтического – сборников поэзии.

Выставка стала в день ее открытия настоящим праздником общения между детьми, которые, к сожалению, не очень часто могут так широко видеть окружающий мир. Пока авторы работ смотрели интересную концертную программу, подготовленную для них юными артистами г.Гомеля – солистами клуба спортивного бального танца "Палетки", участниками театра мод СШ № 35 и др., жюри определило победителей в 12 номинациях. Ими стали Александр Матросов, Игорь Лапицкий, Татьяна Вакарина, Сергей Сапоненко, Денис Гейликман и др. Победители получили ценные подарки, а сладкие призы достались всем участникам выставки без исключения. Специальными Дипломами награждены руководители организаций, принявших участие в этой выставке – Гомельского районного благотворительного общественного объединения "Семья", территориальных центров социального обслуживания населения Железнодорожного и Новобелицкого районов областного центра, городов Мозыря, Речицы, Светлогорска, семейного дома в д.Климовка Гомельского района и др. Спонсором выставки выступил комитет по труду и социальной защите Гомельского облисполкома.

Внесли свою лепту в мероприятие студенты и сотрудники ГГУ имени Ф.Скорины, которых объединяет общество "Друг детей". Собранные ими канцелярские принадлежности, книги тоже переданы в дар участникам выставки.

**Т.ДУБЯК.**

## ІДУЦЬ УСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ

17 чэрвеня ў абітурыентаў завочнага факультэта нашага універсітэта пачаліся ўступныя экзамены. Яны ажыццяўляюцца на 12 спецыяльнасцей. Сёлета без адрыву ад вытворчасці пачнецца падрыхтоўка спецыялістаў па фізічнай культуры для дашкольных устаноў.

Усяго на бюджэтныя і платныя месцы дзяржаўным планам набору на завочны факультэт прадугледжана прыняць 400 чалавек. Прэтэндэнтаў жа амаль удвая больш. Самы высокі конкурс на платную спецыяльнасць "Аздараўленчая і лячэбная фізічная культура": больш чым па тры чалавекі на месца. Найменьшая колькасць паступаючых аказалася на спецыяльнасць "Матэматыка".

Прайшоўшыя па конкурсу на планавыя бюджэтныя месцы будуць залічаны ва універсітэт да 5 ліпеня, на ўмовах аплаты навучання – да 31 жніўня.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат факультэта псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі, калектыў кафедры сацыяльнай і педагагічнай псіхалогіі горача віншуюць асістэнта названай кафедры **ГАПАНОВІЧА-КАЙДАЛАВА Мікалая Уладзіміравіча** з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата псіхалагічных навук.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана дацэнт кафедры эканамічных тэорый **ПУХАВА Наталля Паўлаўна.**

## Спорт "БАГАТЫ ЎРАДЖАЙ" ТРЭНЕРА

У спартыўным комплексе Магілёўскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта з 14 па 16 чэрвеня праходзіў чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па паўэрліфтынгу. Паспяхова выступілі на ім выхаванцы старшага выкладчыка кафедры фізічнай культуры і спорту ГДУ майстра спорту Уладзіміра Галавача. Адразу трое з іх выканалі нарматыў для прысваення звання "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь". Гэта студэнт трэцяга курса эканамічнага факультэта Максім Пятроўскі і пяцікурснік факультэта фізічнай культуры Міхаіл Антропаў, якія ў вагавай катэгорыі да 52 кг занялі адпаведна другое і трэцяе месцы. Першакурснік факультэта фізічнай культуры Мікалай Жукоўскі выканаў запаветны нарматыў у вагавай катэгорыі да 90 кг.

Усяго ў сёлетнім годзе Уладзімірам Галавачом падрыхтавана ўжо 4 майстры спорту нашай краіны.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

з прафсаюзнай канферэнцыі

# ПРАЦАВАЦЬ ЯШЧЭ ЁСЦЬ НАД ЧЫМ

***Адбылася справаздачная канферэнцыя прафсаюзнай арганізацыі супрацоўнікаў універсітэта. На парадак дня былі вынесены для абмеркавання справаздачы прафсаюзнага камітэта, яго рэвізійнай камісіі аб дзейнасці за два апошнія гады, давыбары членаў прафкама і прыняцце Калектыўнага дагавора ГДУ імя Ф.Скарыны на 2002-2004 г.г.***

***У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел абраныя дэлегаты, а таксама рэктар, прарэктары, дэканы факультэтаў, загадчыкі кафедр, кіраўнікі структурных падраздзяленняў.***

Старшыня прафкама Г.І.Варатніцкі пачаў справаздачны даклад з прыемнай навіны: згодна рашэння ЦВК галіновага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь прафсаюзнай арганізацыі ГДУ імя Ф.Скарыны, якая налічвае ў сваіх радах 1212 членаў, нададзены статус райкама прафсаюза. Гэта азначае павелічэнне колькаснага складу прафкама: 12 чалавек уваходзіць у яго прэзідыум, які будзе збірацца на свае пасяджэнні раз у месяц, і астатнія 24 члены агульным саставам – раз у квартал.

Дакладчык усебакова ахарактарызаваў работу прафсаюзнага камітэта, яго шасці камісій, якія працавалі згодна Калектыўнага дагавора, Статута універсітэта, асвятліў пытанні, якія ахаплівалі ўсе сферы жыццядзейнасці універсітэцкага калектыву – фінансаванне і зарплата, навуковыя дасягненні, паказчыкі вучобы студэнтаў, стан працоўнай дысцыпліны, культурна-масавыя мерапрыемствы, прысвечаныя знамянальным датам і святам, сацыяльная абарона (аздараўленне, выдзяленне матэрыяльнай дапамогі) і інш. У прыватнасці адзначалася, за два справаздачныя гады матэрыяльнай дапамогі было аказана калектывам факультэтаў і падраздзяленняў на агульную суму каля 5 млн. руб., выдзелена 277 пуцёвак, 178 з якіх – бясплатна, на культурна-масавую, спартыўную работу – адпаведна звыш 3,5 млн. руб. і 800 тыс. руб. Навагодніх падарункаў было набыта на суму 1620 тыс. руб., 225 тыс. руб. выдаткавана на ўшанаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, пажылых людзей, лепшых працаўніц да Міжнароднага жаночага свята. Прафкам заўсёды заахвочвае таксама пераможцаў універсітэцкай спартакіяды "Здароўе", аплачвае арэнду басейна, які наведваюць члены універсітэцкага калектыву са сваімі дзецьмі. Зараз атрымалі на першы месяц лета пуцёўкі ў аздараўленчы лагер "Сасновы бор" 17 дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Шмат зроблена па добраўпарадкаванню тэрыторыі, прылягаючай да універсітэта, вучэбна-навуковай базы "Чонкі", у чым вялікая заслуга фізічнага і біялагічнага факультэтаў, факультэта фізічнай культуры і спорту, будучых матэматыкаў і юрыстаў, іншых падраздзяленняў.

Г.І.Варатніцкі засяродзіў увагу і на нявырашаных пакуль праблемах і пытаннях: з-за адсутнасці фінансавых сродкаў закансерваваны спартыўны комплекс па вул. Песіна, вялікі аб'ём рамонтных работ патрабуецца зрабіць у вучэбных карпусах №№ 1, 3, у калектывах інтэрнатаў ёсць таксама свае недапрацоўкі, ёсць прэтэнзіі да работнікаў з ліку абслугоўваючага персаналу (сантэхнікі, электрыкі, вадзіцелі), якія неаднойчы карысталіся матэрыяльнай дапамогай, выдзеленай прафкамам, а прафсаюзныя ўзносы не плацяць, і інш.

У дакладзе адзначалася, што ў апошні час прафсаюзам давялося працаваць у складаных умовах. Урадам былі прыняты новыя заканадаўчыя і нарматыўныя акты, якія абмяжоўваюць дзеючую сістэму сацыяльнага забеспячэння, забаранілі наймальніку пералічваць цэнтралізавана прафсаюзныя ўзносы па безнаяўнаму разліку, што з'яўляецца парушэннем арт.107 Працоўнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь. Ва універсітэце члены прафсаюза вымушаны былі збіраць узносы наяўнымі грашыма па ведамасцях. Своечасова, без затрымак іх здавалі ў прафкам біялагічны, фізічны факультэты, факультэт замежных моў, вучэбны аддзел і інш. Цяпер вырашана пытанне з філіялам Беларусбанка, які абслугоўвае ГДУ, згодна падпісанага кожным членам прафсаюза плацежнага даручэння адлічваць прафузносы цэнтралізавана. З прафсаюзнай арганізацыі універсітэта выйшлі 40 чалавек з абслугоўваючага персаналу і 38 выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Г.І.Варатніцкі прызнаў у гэтым і віну прафкамаўскіх работнікаў, якія мала тлумачылі людзям аб функцыях прафсаюза. Сітуацыя, якая склалася на сённяшні дзень у самай масавай грамадскай арганізацыі ў выніку палітыкі ўрада, усё ж не павінна выклікаць у людзей пачуццё безвыходнасці, трэба ўмацоўваць аўтарытэт прафсаюза ў працоўным калектыве.

З дакладам аб рабоце рэвізійнай камісіі за справаздачны перыяд выступіла яе старшыня Т.У.Ушак.

У спрэчках па дакладах прынялі ўдзел старшыня жыллёва-бытавой камісіі прафкама М.М.Фядосенка, які ахарактарызаваў стан спраў з улікам работнікаў універсітэта, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, старшыня Савета жанчын ГДУ Т.І.Язэпава, якая расказала аб яго цесным творчым супрацоўніцтве з прафкамам і адміністрацыяй, і рэктар прафесар М.В.Селькін. Міхаіл Васільевіч, у прыватнасці, адзначыў, што прафсаюзная арганізацыя універсітэта, нягледзячы на ўсе аб'ектыўныя складанасці, выстаяла, працуе на карысць нашай агульнай справы. Ён даў станоўчую ацэнку дзейнасці прафсаюзнага камітэта.

Дэлегаты канферэнцыі прызналі работу прафкама за справаздачны перыяд здавальняючай, зацвердзілі даклад рэвізійнай камісіі.

У склад прафкама давыбраны 23 члены, абраны яго прэзідыум.

Па інфармацыі старшыні прафкама Г.І.Варатніцкага на канферэнцыі прыняты Калектыўны дагавор ГДУ імя Ф.Скарыны на 2002-2004 г.г., перад рэктаратам пастаўлена пытанне аб адшуканні грашовых сродкаў на працяг работ у пераліку нявыкананых пунктаў папярэдняга Калектыўнага дагавора па добраўпарадкаванню тэрыторыі універсітэта, рамонту карпусоў, інтэрнатаў.

На канферэцыі прынята таксама Пагадненне паміж рэктаратам і калектывам студэнтаў па сацыяльна-эканамічных пытаннях на 2002-2004 г.г., якое з'яўляецца дадаткам да Калектыўнага дагавора універсітэта. З інфармацыяй па гэтаму пытанню выступіла старшыня прафкама студэнтаў Н.І.Колтышава.

**Т.ДУБЯК.**

НА ФЕСТЫВАЛІ Ў ПОЛЬШЧЫ

# ПАЦВЕРДЗІЛІ ВЫСОКАЕ МАЙСТЭРСТВА

Беларуская зямля славутая не толькі прыроднымі багаццямі, рэкамі ды азёрамі, але і сваімі талентамі. Аб гэтым яшчэ раз яскрава засведчыла тая культуровая імпрэза, актыўны ўдзел у якой прынялі студэнты і выкладчыкі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Размова ідзе аб XXI Міжнародным фестывалі праваслаўнай музыкі ў польскім горадзе Гайнаўка, што на Беласточчыне. Народная харавая капэла "Дзянніца", якую вось ужо 13 год узначальвае Мікалай Аляксандравіч Казлоў, атрымала запрашэнне прыняць удзел у фестывалі, што само па сабе з'яўляецца вялікім гонарам як для ГДУ, так і для нашай рэспублікі. На жаль, эканамічны крызіс у Беларусі адбіўся і на сістэме народнай адукацыі, таму сродкі на паездку студэнты былі вымушаны шукаць самі. Тым не менш хочацца выказаць падзяку рэктару нашага універсітэта М.В.Селькіну, галоўнаму бухгалтару І.А.Куравай і старшыні прафкама студэнтаў Н.І.Колтышавай за тое, што яны аказалі карысную матэрыяльную дапамогу.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці і складанасці, калектыў здолеў прыехаць у Гайнаўку. Фестываль праходзіў з 28 мая па 2 чэрвеня 2002 г. На гасцінную польскую зямлю з'ехаліся калектывы з Расіі, Украіны, Арменіі, Македоніі, Босніі, Герцагавіны, Літвы, Эстоніі, Фінляндыі і нават хор Праваслаўнай Тэалагічнай семінарыі з далёкай Індыі.

Харавая капэла "Дзянніца" выступіла на конкурсе з праграмай, складзенай з 5 песнапенняў рэлігійнага характару. Акрамя асноўнай праграмы спевакі з Гомеля прымалі ўдзел у канцэртах у г.Беластоку, дзе яны паказвалі сваё майстэрства перад польскай публікай у залах філармоніі і Медыцынскай акадэміі. Акрамя таго, капэла спявала на заключных гала-канцэртах у Гайнаўцы і Беластоку. І паўсюль выступленні "Дзянніцы" суправаджаліся апладысментамі і кветкамі ад ураджаных слухачоў. Аб цікаўнасці палякаў да беларускіх спевакоў сведчыць і той факт, што Беластоцкае радыё ўзяло інтэрв'ю ў М.А.Казлова, а ў дадатак да гэтага групавы фотаздымак капэлы быў памешчаны ў Інтэрнэце на сайце фестывалю.

Акрамя канцэртных выступленняў калектыў браў удзел у культурнай праграме, падрыхтаванай польскім бокам. Асабліва цікавым было наведванне Белавежскай пушчы. Тут арганізавалі пікнік каля вогнішча, дзе ў добразычлівай атмасферы прадстаўнікі розных краін размаўлялі адзін з адным ды разам спявалі песні.

Што ж датычыцца самаго фестывалю, то журы было вельмі кампетэнтным і прадстаўнічым. Гэта і кампазітар, прафесар, выкладчык Варшаўскай акадэміі музыкі Рамуальд Твардоўскі, і дырыжор Дзяржаўнага хору тэлебачання і радыё Беларусі прафесар Віктар Роўда, і кіраўнік кафедры харавога дырыжыравання Маскоўскай кансерваторыі прафесар Барыс Тэўлін і іншыя. Такім чынам журы фестывалю было аб'ектыўным і строгім, таму 3-е месца, якое заняла народная капэла з Гомеля ў намінацыі "Непрафесійныя свецкія калектывы", можна лічыць сведчаннем не толькі высокага майстэрства капэлы і яе кіраўніка, але і пэўным крытэрыем той палітыкі, якую дзяржава праводзіць па падтрымцы самадзейных музычных калектываў.

**Ігар ВОДНЕЎ,**
**студэнт 4 курса гістарычнага факультэта, удзельнік харавой капэлы "Дзянніца".**

ВЫНІКІ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ

# УДАСКАНАЛЬВАЦЬ ВЫХАВАЎЧУЮ РАБОТУ

***У бягучым навучальным годзе ў ГДУ быў аб'яўлены конкурс на лепшую арганізацыю выхаваўчай работы сярод факультэтаў. Яго асноўныя мэты і задачы – актывізацыя выхаваўчай работы, павышэнне яе эфектыўнасці, вывучэнне вопыту факультэтаў па фарміраванню грамадзянскіх, сацыяльных і асабовых якасцей маладога чалавека.***

У адпаведнасці з Палажэннем аб аглядзе-конкурсе намеснікі дэканаў па выхаваўчай рабоце прадставілі зводныя справаздачы па асноўных яе накірунках на разгляд камісіі, якую ўзначальваў старшыня Каардынацыйнага савета прарэктар па выхаваўчай рабоце А.В.Лысянкоў. Пасля грунтоўнага аналізу справаздачнай інфармацыі камісія падвяла вынікі, якія былі аб'яўлены на вечары ўшанавання сёлетніх пяцікурснікаў ГДУ – актывістаў грамадскага і культурнага жыцця універсітэта. Аб гэтым газета ГДУ паведамляла ў сваім нумары за 11 чэрвеня г.г. Нагадаем чытачам, што першыя тры прызавыя месцы занялі адпаведна факультэт фізічнай культуры і спорту, біяфак і эканомфак. А далей месцы размеркаваліся наступным чынам: 4-е – філфак, 5-е – факультэт замежных моў, 6-е – матфак, 7-е – юрыдычны і гістарычны факультэты, 8-е – геолага-геаграфічны факультэт, 9-е – факультэт псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі і 10-е – фізічны факультэт. Намеснікі дэканаў па выхаваўчай рабоце А.Я.Іванец, М.М.Дайнэка, П.П.Саковіч, С.І.Ханеня, А.Д.Садоўская, В.Л.Мярэжа, А.І.Стральцоў, Я.А.Броўкін, Т.А.Шафарэнка, Т.В.Аўдоніна і Т.П.Жалонкіна за важкі ўклад у арганізацыю выхаваўчай работы заахвочаны грашовымі прэміямі.

Вызначаны пераможцы і ў наступных намінацыях:

**арганізацыя выхаваўчага працэсу** (стан дакументацыі, яе выкананне). Найбольшую колькасць балаў набраў фізічны факультэт, які прадаставіў падрабязную інфармацыю аб навуковай дзейнасці студэнтаў;

**выніковасць вучэбнага працэсу.** У ёй лідэрамі сталі тры факультэты, якія набралі роўную колькасць балаў: факультэт замежных моў, гістарычны і біялагічны факультэты;

**эстэтычнае выхаванне** (культурна-масавыя мерапрыемствы ва універсітэце і за яго межамі, удзел у творчых конкурсах). Найбольшую колькасць балаў набралі факультэт фізічнай культуры і спорту і эканомфак;

**спартыўна-масавая работа, мерапрыемствы па прафілактыцы СНІДу, наркаманіі і курэння.** Бясспрэчным лідэрам тут стаў факультэт фізічнай культуры і спорту. Эканомфак таксама можа ганарыцца сваімі спартыўнымі поспехамі: тут вялікая колькасць студэнтаў займаецца рознымі відамі спорту, пасляхова ўдзельнічае не толькі ва універсітэцкіх, але і гарадскіх, абласных, рэспубліканскіх спаборніцтвах і займае прызавыя месцы. Дастатковую колькасць балаў набралі і будучыя біёлагі;

**працоўная дзейнасць** (правядзенне рамонтных работ у карпусах, удзел у будатрадаўскім руху, уборка замацаваных тэрыторый). Практычна ўсе факультэты працавалі добра і атрымалі максімальную колькасць балаў. Па будатрадаўскай дзейнасці інфармацыю даў толькі эканомфак, які стаў лідэрам у названай намінацыі;

**узаемадзеянне з Каардынацыйным саветам, сістэма інфарміравання** студэнтаў (наяўнасць выхаваўчай аргструктуры – нам. дэканаў, куратараў, студэнцкага актыву, насценнага друку). Пераможцам стаў біялагічны факультэт, не на многа ад якога адстаў факультэт фізічнай культуры і спорту;

**маральна-прававая культура студэнтаў** (з факультэтаў, якія мелі парушэнні, здымаліся балы, а за наяўнасць падзяк пабочных арганізацый – дабаўляліся.). Дзве падзякі былі адрасаваны студэнтам юрыдычнага факультэта ад огранаў унутраных спраў. На біяфаку, факультэтах замежных моў, псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі парушэнняў не было адзначана, чаго нельга сказаць пра фізічны факультэт, дзе была самая большая колькасць парушэнняў. Таму пры размеркаванні месц ён аказаўся апошнім;

**арганізацыя жыцця студэнтаў у інтэрнатах** (правядзенне мерапрыемстваў і рэгулярнасць наведвання выкладчыкамі). Тут праводзілі мерапрыемствы толькі эканамічны і біялагічны факультэты, факультэт замежных моў. Ад астатніх, на жаль, такой інфармацыі не паступіла;

**удзел нам. дэканаў у распрацоўцы дакументацыі.** У ёй найбольшую колькасць балаў набралі юрысты.

З вышэйсказанага вынікае, што практычна кожны факультэт вызначыўся ў адной і нават у некалькіх намінацыях.

Правядзенне агляду-конкурсу на лепшую арганізацыю выхаваўчай работы сярод факультэтаў стане ў нашым універсітэце традыцыяй. А пажаданне такое – няхай з кожным годам аўтарытэтнай камісіі будзе ўсё больш цяжка вызначыць факультэт-пераможцу.

**А.НАЗАРАНКА,**
**педагог-арганізатар аддзела выхаваўчай работы ГДУ.**

память

# ДУХОВНОЕ НАСЛЕДИЕ




**Мудрость древних гласит: "Люди живут столько, сколько мы о них помним".**

Льва Николаевича Гаранина будут помнить очень долго близкие, друзья, коллеги, многочисленные ученики. Они, равно как и продолжающие свою учебу на историческом факультете студенты, с глубокой благодарностью вспоминают этого интеллигентного, доброжелательного, высокообразованного человека, без остатка отдававшего свои знания, опыт и душевную теплоту студентам и коллегам.

Почти половину своей жизни он проработал на кафедре всеобщей истории нашего университета. Продолжительное время Лев Николаевич тяжело болел. Именно этот недуг заставил его в расцвете творческих сил уйти на пенсию. И все же он сохранил живую связь с кафедрой и факультетом. До последних своих дней Лев Николаевич консультировал студентов и молодых преподавателей, не прерывались нити его творческого общения с коллегами. Л.Н.Гаранин оставил нам в наследство не только светлую память о себе – удивительном человеке, особенной личности, видном ученом, талантливом педагоге, но и поистине бесценную библиотеку по зарубежной и отечественной истории. Эти книги семья Гараниных собирала всю свою жизнь. Часть их Лев Николаевич подарил своим ученикам, коллегам и кафедре. По его воле это богатое, профессионально подобранное собрание передается в дар университетской библиотеке. Оно составлено из книг по истории Германии, Франции, истории политических движений в странах Западной Европы, истории международных отношений, мемуарной литературы, энциклопедических изданий и научной периодики. Особенно ценными являются работы классиков исторической науки Е.В.Тарле, С.М.Соловьева, Ж.Жореса, А.З.Манфреда, многотомная "Всемирная история" и другие фундаментальные издания.

Книги, как и люди, имеют свою судьбу. Подаренная Львом Николаевичем Гараниным библиотека послужит благородному делу профессионального и гуманистического воспитания студенческой молодежи, ибо, как сказал Цицерон: "История – это жизнь памяти".

**КОЛЛЕГИ, УЧЕНИКИ, СТУДЕНТЫ.**

# ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

Иван ХАРЛАМОВ

### О "СОЛНЕЧНОМ БЕРЕГЕ"

Здоровье поправить
С надеждой и верой
Сюда мы
Стремимся не зря...
Солнечный берег!
Солнечный берег –
Чудо седого Днепра!

Климат и впрямь
Здесь бодряще-здоровый, –
Лес, луговые цветы...
Тут нас врачуют
Воздух сосновый,
Солнце и всплески воды.

Тают, как в дымке,
Здесь грусть и заботы, –
Тешит нас
Песенный лад...
Смех и веселье,
Шутки-остроты
Душу и силы крепят.

Здоровья набраться
С надеждой и верой
Сюда мы
Спешили не зря...
Солнечный берег!
Солнечный берег –
Чудо седого Днепра!

***

Как жить легко,
Когда все знаешь!
Не блудишь
В потемках дорог...
Друзей
По нраву выбираешь.
Во всем свой видишь
Смысл и прок.

И хоть бег времени
Так зыбок,
От суеты и дел
Устав,
Больших не делаешь
Ошибок,
До мелочей
Все рассчитав.

Умом развеешь
Все печали,
Что так порою
Сердце жгут...
И все ж
Неведомые дали
Меня
Безудержно влекут!

Кацярына КАРАТЫШ,

студэнтка гр. Б-32
філалагічнага факультэта

### ЦУДОЎНАЯ ПЕСНЯ

Цудоўная песня ў сэрцы гучыць,
І з гэтаю песняй мне хочацца жыць.
– Аб чым тая песня? – спыталі ў мяне.
Яна аб прыгожай чароўнай вясне.
Яна аб цудоўным дзівосным жыцці
І аб трапяткім незямным пачуцці.
Няма ў гэтай песні ні дрэнных, ні злых,
Няма жорсткіх слоў, што так колюць нам слых.
І толькі пяшчота, цяпло і спакой
Пануюць у песні дзівоснай маёй.
– Давай, заспявай, – кажуць, – песню хутчэй,
Каб стала на сэрцы адразу цяплей,
І біцца яно наўздагон пачало,
І ўсё, як у сне, навакол ажыло.

### ПЕСНЯ ЖАЎРУКА

*Нябесны сонечны блакіт*
*І птушка ў вышыні.*
*Пачуй, то жаўранак звініць*
*У соннай цішыні.*
*Прыслухайся, аб чым пяе*
*Малечы той спявак.*
*Ён гімны сонцу аддае,*
*Ён, сапраўды, дзівак.*
*А сонца слепіць і пячэ,*
*Што не ўзняць вачэй.*
*І песня звонкая цячэ*
*Усё вышэй, вышэй.*

Юрий ВИШЕНКОВ

***

Спасибо тебе, муза, ты мой бог.
Я благодарен за возможность мыслить.
По возрастанью складывая мысли,
Я их рифмую, не считая строк.
Спасибо тебе, муза, ты мой бог.
Я изливаю душу на бумаге.
И разрастается любви моей росток
К тебе, поэзия, ты жизнь моя и бог.
Я счастлив в те часы, когда ты рядом,
Когда ты вдохновение даешь,
Когда ты проверяешь острым взглядом
Мои стихи и песни мне поешь.
Спасибо, жизнь, что ты у меня есть,
Спасибо за ошибки и награды.
Я благодарен, мне другой не надо.
Спасибо, жизнь, что ты у меня есть.

Сергей МЕЗГА,

выпускник заочного факультета
специальности "История"

### СОНЕТ

Люблю тебя – от чувства задыхаюсь –
Как нежные мимозы любишь ты,
В цветах других не видя красоты,
Мимозами так сладострастно наслаждаясь!

Как много я цветов сорвать бы смог –
Бесчувственно, не слыша аромата, –
И не жалеть, что сломан безвозвратно
Прекрасный для кого-то стебелек!

Лишь на мимозу не поднимется рука –
Не потому, что слишком уж хрупка,
А потому, что полюбил в февральские морозы,
Свое безумством страсти сердце опьяня,
В ночи мечту к себе маня –
Тебя, что так похожа на мимозу!

Марина СЕРГЕЕНКО,

студентка гр. Р-41 филфака

***

Я письма старые не жгла
И, видно, верно делала,
Что их на память берегла,
Написанному верила.
Их отправляли мне друзья,
Когда в часы досуга
На ум им приходила я,
Их давняя подруга.
Они наполнены теплом,
Любовью и заботой,
И молодостью золотой,
И трудною работой.
Пускай пройдет немало лет,
Пусть будущее всюду,
И пусть переменится свет –
Я письма жечь не буду.

Марина САВИЦКАЯ,

студентка гр. БА-13
филологического факультета

***

Вы видели, как умирают волны,
С разгоном находя на берег? –
Они спешат обратно в море,
Но погибают тихо в пене.

Вы знаете, как умирает дружба,
Которая жила в тебе годами? –
Она уходит, как волна-подружка:
Не попрощавшись навсегда с друзьями...

Вы видели морской соленый воздух,
Который разъедает, как разлука,
Который говорит тебе тихонько,
Что мы не сможем друг без друга?

Вы видели, как умирает счастье?
Оно кричит, как чайки над водою
И не дает тебе забыть,
Что ты живешь уже не мною...

Вы знаете, как умирает дружба?
Как луч последний солнца над волною.
А знаешь, как уходит детство? –
Не попрощавшись навсегда с тобою...

Алёна АЗЁМА,

студентка гр. БА-13
филологического факультета

***

Безумство ночи, призрак дня
И мракобесие теней
Слагают в памяти людей
Ассоциации огня.

Огонь, как ночь, подчас безумен
И в то же время светл, как день,
И действо таинств он повсюду
Предоставляет. Это – тень.

Огонь несет в себе опасность,
Цвет пылкой страсти – это красный,
А символ дня, тепло и свет,
Всегда желанен для людей.

Такие разные понятья,
Так не похожи друг на друга,
Но все же общего в них много
Найдешь ты сразу. Но откуда?...

Вот так. Простой огонь, а сколько
Поляризованных понятий.
В простом так значимости много,
А люди любят усложнять все.

Безумство – ночь, невинность – день,
Страх, страсть и тайна, с ними –
время:
Огонь не вечен, он – лишь тень,
Он пепел времени, потеря...

Наталья ГОВОРУШКИНА,

студентка гр. ПМ-15
математического факультета

***

Я устала от старых друзей,
От душевной людской пустоты,
От открытых все время дверей
И нелепой смешной суеты.
Все всё время куда-то спешат,
Успевают смотреть на часы
И ворочают наш земной шар,
Где как пот капли свежей росы.
Только я никуда не спешу
Да и время мне некуда деть:
По ночам стихи, песни пишу
И боюсь как бы все не успеть.
Будет нечем себя мне занять,
Избегая людской суеты,
Лучше медленно все успевать,
Чем, успев, жить среди пустоты.

Яна ЧЕРНУХИНА,

слушательница
подготовительных курсов

### УСТАЛОЕ

Когда от грязи устаешь,
Бессильно голову склоняешь.
Пушинкой по ветру плывешь,
Ладонью слезы утираешь.

Когда потеряны слова,
Улыбкой грустной измеряешь
Былой надежды острова
И очень тихо умираешь.

О, как мне хочется взлететь
Над глупым миром,
безобразным.
Любовью сердце обогреть
И думать только о прекрасном.

***

Как больно забывать любовь,
Когда ты знаешь – нет пути обратно.
И лишь луна над головой
Кричит, что ведь сама ты в этом виновата.

Пути обратного нам не найти.
Мы утонули в море нашей боли,
И лишь одно желание в груди –
Скорее отпустить себя на волю.

Нам будет трудно жить с тобой вдали,
Но свет берет свое над болью,
И скоро мы уже не вспомним,
Кто первый предложил уйти.

Станислав ГАЛКОВСКИЙ,

студент 3 курса физического факультета

### БЛЮЗ ПОДЗЕМНОЙ СКРИПКИ

**Вчера весь день шел дождь. Я спустился в подземный переход, там тихо и грустно играла скрипка, ей было плохо. Моя гитара, помолчав, подхватила ее блюзовые нотки.**

Играла скрипка в переходе,
О вдохновеньи и погоде,
О странно синем небосводе,
И неосознанной любви.
Играла скрипка в переходе,
Я где-то слышал это вроде,
Но классика теперь не в моде,
Смычком волненье не зови.

Играла скрипка в переходе,
Ища признания в народе,
И как на обмелелом броде,
Бурлил мотив, струной журча.
Играла скрипка в переходе,
И пес не думал о породе,
А повинуяся природе,
Лизал подошвы скрипача.

Как пела скрипка в переходе,
О звезд далеком хороводе,
И белоснежном теплоходе,
Что манит нас на острова.
Как пела скрипка в переходе,
О сложном жизненном походе,
Где клетка не родня свободе,
Но я ушел, забыв слова.

## знакомьтесь: новые имена



**Серьезно заниматься поэзией Ольга Савельева начала сравнительно недавно, а первые пробы пера были у нее во время учебы в школе, потом в областном лицее. Те несмелые рифмованные строки она посвящала красоте природы, пыталась также писать и прозу.**

**Богатый духовный мир Ольги, ее безграничная фантазия (она очень много читает, особенно исторической, фантастической литературы, увлекается языческими легендами) дали ее творческому воображению мощный импульс как в выборе тем своих стихов, так и выразительных средств. Философская углубленность, которая доминирует в ее стихах, невольно заставляет многое переосмыслить в понимании жизни и тем, кто знакомится с ее поэзией.**

Ольга САВЕЛЬЕВА,

студентка 2 курса факультета иностранных языков.

### ПРОСТО О ЖИЗНИ

"Это просто замкнутый круг..."
"Ария"

Мы глупо ищем смысл жизни
В своей стране, за рубежом,
Пытаясь втиснуть его в призму,
Иль воду превратить в вино.

Себе зачем-то объясняем,
Ответы странные даем,
Как будто все на свете знаем,
Не замечая, как живем.

На Родине нам места мало,
И дом наш собственный не мил,
Кибитка в поле убежала –
И мы за ней теперь спешим...

Друзей меняем, как перчатки,
Врагов меняем, как друзей,
Но тянемся за Раем сладким,
Хоть и живем в миру страстей.

А счастья дольку хочет
каждый...
Епископ ты иль гугенот,
Но тянешься рукой бумажной:
Кто больший оторвет кусок?

И так проходит жизнь слепая –
В слезах, предательстве,
вражде...
Но думал кто, в других стреляя,
Что этим мы несем себе?

Оскалившись, подносим спичку –
И запылал соседский дом.
А это входит ведь в привычку –
Опаливать друзей огнем,

В других сжигать святые чувства –
Любовь, привязанность, мечту,
И ненависть будить искусно,
И Свет гасить, впуская Тьму...

Мы глупо ищем смысл жизни...
Быть может, в этом наша суть.
Вот только жизнь не втиснешь
в призму,
Ведь жизнь – не глина, это –
путь.

### В ВЕЧНОСТИ...

Не жена я тебе –
Не венчали нас,
Далека от тебя –
То огонь погас.
Птицей в небо лечу –
Крылья сильные,
Звездной тенью брожу –
Ночи длинные.
Над землею свети –
Не найдешь меня,
К краю света иди –
Не увидишь дня,
Мою душу зови –
Не откликнется,
Меня в Космосе жди –
Свет рассыплется.
Золотистой струны
Звуки чистые –
Это капли дождя
Серебристые,
Это крик в Тишине –
Не догнать его,
Это холод во Тьме –
Он венец всего.
Не вернуть нам Судьбы –
Улетела прочь.
Мокрый след от слезы –
Это снова Ночь.
В том Свобода твоя –
В Бесконечности,
Но жена я Ему –
В Вечности...

***

**Разговор Богов с людьми**

*Кто вы, бредущие во мраке?*
*Чего вы ждете от пути?*
*– В конце туннеля светлый факел,*
*К нему судьба наша идти.*
*Зачем пришли вы на планету?*
*Зачем вас Солнце жжет огнем?*
*– Оно дает нам море Света,*
*Дает нам Жизнь, и мы живем.*
*Какие создали вас силы?*
*Чей дух живет в телах людей?*
*– Отнюдь не вы нас породили,*
*А наша сущность – Дух Страстей.*
*Кому вы сердце подчинили?*
*Что есть для вас всесильный Рок?*
*– Любви себя мы подарили,*
*А Рок – ничто, он нам не Бог.*
*Так кто судьбу вашу решает?*
*Под властью чьей живете вы?*
*– В нас сущность чувства составляют,*
*Творцы судьбы своей – лишь мы.*

## ДА ВЕДАМА АБІТУРЫЕНТАЎ

# АПЛАТА ЗА НАВУЧАННЕ: ЯЕ ПАМЕРЫ

На пасяджэнні Савета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, якое адбылося 28 мая г.г., было зацверджана Палажэнне аб платным навучанні ў ГДУ 2002-2003 навучальнага года.

Папярэдні кошт платнага навучання за год устаноўлены ў наступных памерах: для дзённага навучання на наступныя спецыяльнасці – "Руская філалогія"; "Руская філалогія са спецыялізацыяй "Беларуская мова і літаратура"; "Беларуская філалогія"; "Беларуская філалогія са спецыялізацыяй "Англійская мова"; "Беларуская філалогія са спецыялізацыяй "Літаратурная работа ў газетах і часопісах"; "Матэматыка"; "Прыкладная матэматыка (навукова-вытворчая і навукова-педагагічная дзейнасць)"; "Фізіка (навукова-вытворчая і навукова-педагагічная дзейнасць)"; "Фізіка з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць"; "Фізічная электроніка"; "Геалогія і разведка месцанараджэнняў карысных выкапняў"; "Геаграфія"; "Нямецкая мова"; "Гісторыя"; "Гісторыя з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова"; "Фізічная культура"; "Біялогія"; "Геаэкалогія" – **796 тыс. 772 руб.** На спецыяльнасці – "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт"; "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве"; "Камерцыйная дзейнасць"; "Фінансы і крэдыт"; "Сусветная эканоміка"; "Англійская мова"; "Псіхалогія"; "Правазнаўства"; "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі" – **902 тыс. 764 руб.**

Кошт аплаты пры завочным навучанні: на спецыяльнасці – "Руская філалогія"; "Беларуская філалогія"; "Матэматыка"; "Геаграфія"; "Гісторыя"; "Фізічная культура (у тым ліку па скарочанай праграме)"; "Біялогія" – **318 тыс. 709 руб**. На спецыяльнасці – "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт"; "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве"; "Правазнаўства (у тым ліку па скарочанай праграме)" – **361 тыс. 105 руб.**

Нагадаем, што адной з прычын адлічэння студэнтаў з універсітэта, якія набываюць спецыяльнасць на платнай аснове, з'яўляецца невыкананне падпісаных дагавораў і ў першую чаргу несвоечасовая аплата за вучобу.

Магчыма, камусьці з плацельшчыкаў за вучобу прыведзеныя вышэй лічбы здадуцца празмерна высокімі. Каб не ствралася такога ўражання, спашлемся на некаторыя дадзеныя, апублікаваныя ў артыкуле "Дорогие" студенты", змешчаным на 17 старонцы "Аргументов и фактов" № 21 за 2002 г. З гэтай публікацыі вынікае, што ў бягучым навучальным годзе самая дарагая адукацыя была ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. У прыватнасці, плата за навучанне на факультэце міжнародных адносін на стацыянары складала 3000 у.а. у год, а на завочным аддзяленні ад 700 да 1500 у.а.

Кошт навучання ў Мінскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце таксама залежыць ад абранай спецыяльнасці: лячэбная справа і педыятрыя – 900 тыс. руб. у год, стаматалогія – 3 млн. руб., медыка-прафілактычная справа – 1 млн. 700 тыс. руб.

У сярэднім жа па вядучых вышэйшых навучальных установах беларускай сталіцы плата за навучанне ў бягучым навучальным годзе складала: у БДУ – 1400 – 3000 у.а., у Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі – 960 тыс. – 1 млн. 400 тыс. руб., у Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце – каля 860 у.а., у медыцынскім дзяржаўным універсітэце – 1 млн. 700 тыс. руб. – 3 млн. руб., у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце – каля 1000 у.а., у Мінскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М.Танка – 600 – 650 у.а., у Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце – 520 – 680 у.а., у Беларускім дзяржаўным агратэхнічным універсітэце – 800 – 900 у.а.

Няма сумнення ў тым, што ў новым навучальным годзе ў пералічаных вышэй мінскіх ВНУ аплата за навучанне будзе яшчэ вышэйшай. Так што, шаноўныя чытачы, мяркуйце самі, дзе больш выгадна набываць вышэйшую адукацыю.

## О профилактике СПИДа

# КУЛЬТУРА ПОВЕДЕНИЯ – ПРЕГРАДА БОЛЕЗНИ



СПИД (синдром приобретенного иммунного дефицита) – инфекционное заболевание, сопровождающееся разрушением иммунной системы организма. Возбудителем заболевания является ВИЧ – вирус иммунодефицита человека.

На первое марта 2002 г. в Беларуси было выявлено 4097 случаев ВИЧ-инфицированных. Незавидное первенство здесь прочно удерживает Гомельщина – 2735 случаев.

Источник инфекции – больной человек или вирусоноситель. Накопление вируса происходит в крови, сперме, влагалищных выделениях, а также в слезах, слюне, поте. Однако этого бывает недостаточно для передачи заболевания. Заражение происходит при повреждении слизистых оболочек и кожи.

Основными путями передачи инфекции (по данным ВОЗ) являются: сексуальные контакты между людьми, когда один из половых партнеров ВИЧ-инфицирован (80% случаев); использование для инъекций нестерильных шприцев и игл, что свойственно наркоманам (5%); переливание крови или использование препаратов крови от зараженного донора (5%); передача вируса плоду больной женщиной во время беременности, рождения ребенка или в период его грудного вскармливания (1-10%); пересадка органов и тканей, использование донорской спермы.

В Республике Беларусь основной причиной ВИЧ-инфицирования является инъекционное введение наркотиков (78%).

В настоящее время профилактика ВИЧ-инфекции направлена: на повышение сексуальной культуры населения; соблюдение принципа анонимности и добровольности при обследовании; использование для инъекций стерильных одноразовых шприцев и игл.

Профилактика заболевания должна проводиться среди определенных групп людей, которых относят к группам повышенного риска – гомосексуалисты, проститутки, наркоманы, реципиенты донорской крови. В первую очередь должны обследоваться ученики старших классов школ, учащиеся ПТУ, студенты. Наиболее опасными для заражения людей являются гомосексуальные половые контакты.

Основным фактором риска заражения при гомосексуальных, бисексуальных и гетеросексуальных половых контактах является частая смена половых партнеров. В связи с этим основным мероприятием по предупреждению заражения ВИЧ является формирование негативного отношения к случайным половым связям, половым извращениям и распутству.

ВИЧ-инфекция не передается через обычные бытовые контакты людей с больными и вирусоносителями (рукопожатие, пользование телефонным аппаратом, общей ванной, сауной, туалетом, бельем, одеждой и т.д.). ВИЧ неустойчив во внешней среде (при температуре 37°С сохраняет жизнеспособность в течение 5 суток, при 50°С – 30 мин., при 56°С – 10 мин, при 100°С погибает мгновенно). Считается, что при пользовании общественным транспортом, посещении театров, а также при кашле, чихании, дружеском объятии, поцелуе, укусе насекомых ВИЧ не передается.

Нельзя пользоваться чужими предметами личной гигиены: зубными щетками, бритвенными приборами и т.д. ВИЧ чувствителен к моющим средствам, спирту, которые инактивируют его менее чем за 10 минут.

В парикмахерских, косметических салонах должны строго соблюдаться правила дезинфекции инструментов. После каждого посетителя их необходимо обрабатывать теплой водой с мылом, а затем стерилизовать в течение 45 минут. После этого инструменты опускают для хранения в спирт-денатурат до повторного использования. Настольное стекло после каждого посетителя протирают 3% раствором хлорамина.

Медицинский инструментарий после использования обязательно нужно стерилизовать.

До настоящего времени создать вакцину против СПИДа не удалось.

По закону РБ "О мерах профилактики заражения вирусом СПИД" все иностранные граждане, прибывающие на учебу или работу в страну на срок более 3 месяцев, подлежат проверке на СПИД. Иностранные граждане, инфицированные ВИЧ, подлежат депортации из страны. Граждане республики, которые были за границей более 3 месяцев, также при возвращении на родину проходят обследование на ВИЧ. Предусмотрены и меры наказания лиц, которые сознательно распространяют ВИЧ-инфекцию (согласно ст. 157 УК РБ они наказываются лишением свободы на срок от 5 до 12 лет).

Проконсультироваться и обследоваться на ВИЧ-инфекцию можно в любой поликлинике, в том числе и анонимно, или в Областном Центре профилактики СПИДа по адресу: г.Гомель, ул.Сожская, 1, тел. 53-71-40.

**А.ПАУК,**
**кандидат медицинских наук, доцент кафедры ОЛФК.**

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ аб'яўляе прыём у аспірантуру ў 2002 годзе

**з адрывам ад вытворчасці**
*па спецыяльнасцях:*

матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лічбаў; механіка дэфармуемага цвёрдага цела; оптыка; аналітычная хімія; фізіялогія; экалогія; матэрыялазнаўства ў машынабудаванні; тэлекамунікацыйныя сістэмы і камп'ютэрныя сеткі; матэматычнае мадэліраванне, лічбавыя метады і комплексы праграм; эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай; фінансы, грашовы абарот і крэдыт; бухгалтарскі ўлік, статыстыка; беларуская літаратура; руская літаратура; беларуская мова; руская мова; тэорыя і гісторыя дзяржавы; гісторыя прававых вучэнняў; крымінальны працэс, крыміналістыка і судовая экспертыза, аператыўна-пошукавая дзейнасць; грамадзянскі працэс; арбітражны працэс; агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі; тэорыя і методыка навучання і выхавання (англійская мова сярэдняй і вышэйшай адукацыі); тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі, аздараўленчай і адаптыўнай фізічнай культуры; гідрагеалогія; геафізіка, геафізічныя метады пошукаў карысных выкапняў; фізічная геаграфія і біягеаграфія глеб і геахімія ландшафтаў.

**без адрыву ад вытворчасці**
*па спецыяльнасцях:*

аналітычная хімія; экалогія; эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай: тэорыя кіравання эканамічнымі сістэмамі; макраэканоміка; эканоміка, арганізацыя і кіраванне прадпрыемствамі, галінамі, комплексамі; кіраванне інавацыямі; рэгіянальная эканоміка; лагістыка; эканоміка працы; эканоміка народанасельніцтва і дэмаграфія; эканоміка прыродакарыстання; і інш; беларуская літаратура; руская літаратура; руская мова; грамадзянскае права; прадпрымальніцкае права; сямейнае права; міжнароднае ўласнае права; крымінальнае права і крыміналогія; крымінальна-выканаўчае права; адміністрацыйнае права; фінансавае права; тэорыя і методыка навучання і выхавання (англійская мова сярэдняй і вышэйшай адукацыі); тэорыя і методыка навучання і выхавання (геаграфія сярэдняй і вышэйшай адукацыі); эканамічная, сацыяльная і палітычная геаграфія.

Паступаючыя ў аспірантуру здаюць конкурсныя ўступныя экзамены па філасофіі, замежнай мове і спецыяльнай дысцыпліне ў аб'ёме дзеючай праграмы для ВНУ. Навучанне ў аспірантуры здзяйсняецца з адрывам і без адрыву ад вытворчасці. Тэрмін навучання ў аспірантуры з адрывам ад вытворчасці – 3 гады, без адрыву ад вытворчасці – 4 гады. У аспірантуру прымаюцца асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю і здольнасць да навуковых даследаванняў. Да ўступных экзаменаў у аспірантуру прыёмнымі камісіямі дапускаюцца асобы, якія маюць вопыт практычнай работы (у тым ліку апублікаваныя работы), і выпускнікі ВНУ па рэкамендацыям саветаў ВНУ (факультэтаў) пры ўмове **высокага ўзроўню акадэмічнай падрыхтоўкі.**

Прыём і навучанне ў аспірантуры для фізічных асобаў, а таксама ведамстваў (арганізацый), якія не адносяцца да Міністэрства адукацыі, здзяйсняецца на аснове дагавораў або кантрактаў паміж фізічнай асобай, ведамствам (арганізацыяй) і ГДУ. Навучанне ў аспірантуры замежных грамадзян рэгулюецца міждзяржаўнымі дамоўленасцямі, дагаворамі з арганізацыямі або кантрактамі паміж замежнымі грамадзянамі і ГДУ.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру, падаюць заяву на імя рэктара ГДУ і прыкладваюць наступныя дакументы:

– асабісты лісток па ўліку кадраў, аўтабіяграфію і тры фотакарткі памерам 4Х6;

– спіс і копіі апублікаваных навуковых работ, вынаходніцтваў, патэнтаў і спіс справаздач аб выкананых даследаваннях і распрацоўках; асобы, якія не маюць апублікаваных навуковых работ, вынаходніцтваў і патэнтаў, прадстаўляюць навуковыя даклады (рэфераты) па выбранай тэме ў адпаведнасці са спецыяльнасцю;

– выпіску з пратакола пасяджэння савета (факультэта) вышэйшай навучальнай установы для асоб, рэкамендаваных у аспірантуру непасрэдна пасля заканчэння вышэйшых навучальных устаноў;

– копіі дыплома аб вышэйшай адукацыі і выпіску з заліковай ведамасці (дадатак да дыплома);

– выпіску з працоўнай кніжкі;

– копіі дакументаў аб здачы кандыдацкіх экзаменаў (пры наяўнасці ў паступаючых у аспірантуру здадзеных кандыдацкіх экзаменаў);

– пашпарт, дыплом аб заканчэнні вышэйшай навучальнай установы і дакументы аб здачы кандыдацкіх экзаменаў прад'яўляюцца асабіста.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру на накіраванню ведамстваў (арганізацый) або самастойна, дадаткова прадстаўляюць праект дагавора (кантракт) паміж накіроўваючым бокам і ГДУ.

Асобы, якія здалі поўнасцю або часткова кандыдацкія экзамены, вызваляюцца ад адпаведных уступных экзаменаў і карыстаюцца пераважным правам залічэння ў аспірантуру па конкурсу.

Акрамя таго, пры роўнай колькасці балаў перавагу пры залічэнні маюць асобы ў якіх:

– больш высокая адзнака на ўступным экзамене па спецыяльнасці;

– спіс публікацый, а таксама стаж работы па дадзенай спецыяльнасці;

– ёсць дыпломы лаўрэатаў рэспубліканскага агляду-конкурсу студэнцкіх навуковых работ і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый.

Асобы, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсу, могуць быць залічаны ў аспірантуру на кантрактнай аснове.

Асобы, залічаныя ў аспірантуру з адрывам ад вытворчасці, забяспечваюцца стыпендыяй. Іншагароднім прадстаўляецца інтэрнат.

Асобы, якія раней прайшлі поўны курс навучання ў аспірантуры, правам паўторнага навучання ў аспірантуры без аплаты за навучанне не карыстаюцца.

Уступныя экзамены праводзяцца з **1 па 30 кастрычніка 2002 года.**

Прыём дакументаў з **28 жніўня па 10 верасня 2002 года.**

Дакументы накіроўваць на адрас:

246699, г.Гомель, вул Савецкая, 104, аддзел аспірантуры (п. 4-11), тэл. 57-83-77.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 299.
Падпісана да друку 21.06.2002 г.